*А. К. Шымак*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Shymak*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 327(470+571)**

# СТАСУНКІ ЛЖЭДЗМІТРЫЯ І І РЫМСКАЙ КУРЫІ

# RELATIONS BETWEEN THE FALSE DEMITRY I AND THE ROMAN CURIA

*У артыкуле разглядаюцца праблемы ўзаемаадносінаў Расійскай дзяржавы і Рымскай курыі падчас Смуты пачатку XVII ст. Кантакты з Рымам актыўна падтрымліваліся на працягу ўсяго перыяду царавання першага самазванца. Падтрымка з боку Рыма была неабходнай для Лжэдзмітрыя І, каб адчуваць сябе больш самастойным у адносінах з Жыгімонтам ІІІ. Рымская курыя падтрымала дыпламатычную гульню і не адмаўлялася ад перамоваў і стасункаў.*

*Ключавыя словы: знешняя палітыка; дыпламатыя; Рымская курыя; Расійская дзяржава; Рэч Паспалітая; Смута.*

*The article examines the problems of relations between the Russian state and the Roman Curia during the Troubles of the early XVII century. Contacts with Rome were actively maintained throughout the reign of the first impostor. Support from Rome was necessary for False Dmitry I to feel more independent in his relationship with Sigismund III. The Roman Curia supported the diplomatic game and did not give up negotiations and relations.*

*Keywords: foreign policy; diplomacy; Roman curia; Russian state; Res Publica; Troubles.*

Гісторыя ўзаемаадносінаў Расійскай дзяржавы і Рымскай курыі знаходзіць сваё адлюстраванне ў шматлікіх навуковых даследаваннях, дзе разглядаюцца пытанні міжнародных адносінаў і знешняй палітыкі, царкоўнай гісторыі, праблемы крыніцазнаўства і гістарыяграфіі. Немагчыма пакінуць без увагі і такі аспект дыпламатычных кантактаў Масквы і Рыма, як палітыка ў часы Лжэдзмітрыя І.

Падзеі канца XVI – пачатку XVII ст. у гісторыі Расіі сталі называцца «Смутным часам». Смута стала складаным комплексам супярэчнасцей, якія спалучалі і эканамічныя, і палітычныя, і сацыяльныя фактары. Некаторыя гісторыкі, у прыватнасці ў XIX ст., у якасці прычыны Смуты называлі таксама імкненне Рымскай курыі падпарадкаваць Праваслаўную Царкву і дзейнасць езуітаў [2, с. 4].

З канца XV ст. адной з галоўных знешнепалітычных задач Апостальскай Сталіцы стала правядзенне агульнахрысціянскага крыжовага паходу для выгнання туркаў з Еўропы. Пасля падзення Канстанцінопаля асманская небяспека станавілася ўсё большай. Спробы рымскіх пантыфікаў, пачынаючы

з папы Пія II (1458–1464), схіліць туркаў на бок хрысціянства не прынеслі ніякага плёну. У гэтых умовах Курыя пачала шукаць шляхі для арганізацыі антыасманскай кааліцыі [20].

З канца XV ст., у часы кіравання маскоўскага князя Івана III, распачынаецца шматлікі абмен пасольствамі паміж Масквой і Рымам. Але інтарэсы бакоў у поўнай меры ніколі не супадалі. Пасольствы Сямёна Талбузіна (1475 г.), братоў Дзмітрыя і Мануіла Ралевых (1488 г.), Мітрафана Карачарава і Дзмітрыя Ралева (1500 г.), акрамя культурных і эканамічных мэтаў вырашалі задачы палітычнага характару [16, с. 37–54]. У гэты час ва Усходняй Еўропе пачаў складвацца асаблівы вузел супярэчнасцей, які закранаў інтарэсы некалькіх дзяржаў: Княства Маскоўскага «всея Руси», Вялікага Княства Літоўскага, Кароны Польскай, Лівонскага ордэна. У часы кіравання Івана III і Васіля III стала відавочным, што адносіны з Рымам могуць паспрыяць вырашэнню спрэчных тэрытарыяльных пытанняў, дапамогуць стварыць лепшыя ўмовы для гандлю ў Прыбалтыцы, і наогул падымуць аўтарытэт маскоўскай велікакняжацкай улады. У сваю чаргу Рымская курыя, зацікаўленая арганізацыяй крыжовага паходу супраць Асманскай імперыі, стала актыўным, калі не ўдзельнікам, то назіральнікам за ўсходнееўрапейскімі канфліктамі.

У 1547 г. Княства Маскоўскае «всея Руси» стала Расійскім царствам, але пераемнасць знешнепалітычнай канцэпцыі ва ўзаемаадносінах з Рымскай курыяй захавалася. Іван IV працягнуў «палітыку заляцанняў» з Рымам, распачатую яго дзедам і бацькам, і здолеў не дапусціць дамінавання рэлігійна-ідэалагічнай падаплёкі ў вайне з Рэччу Паспалітай.

Пасля яго смерці прадстаўнік папы Камулей у 1594 і 1597 гг. знаходзіўся пры двары апошняга цара з роду Рурыкавічаў – Фёдара Іванавіча – для перамоваў аб сумеснай барацьбе з туркамі, але мэта яго вандравання не была дасягнута [15].

І вось у 1603 г. у Рэчы Паспалітай з’явіўся «цудам уратаваны» ад смерці сын Івана IV царэвіч Дзмітрый, які шукаў любой дапамогі, Рымская курыя не засталася па-за яго ўвагай.

Першыя звесткі аб Лжэдзмітрыі I прадставіў Адам Вішнявецкі, які накіраваў даклад каралю Жыгімонту III, дзе паведамлялася, што «царэвіча Дзмітрыя» падмянілі ў спальні вуглічанскага палацу, і нават маці не заўважыла, што загінула не царскае немаўля [19, с. 65]. У лістападзе 1603 г. кароль паведаміў нунцыю Кладзіё Рангоні[1] аб цудоўным з’яўленні «царэвіча Дзмітрыя» [6, с. 2]. У той жа час сталі распаўсюджвацца звесткі аб схільнасці Лжэдзмітрыя I да каталіцтва. Невыпадкова і тое, што тайну

[1]Між іншым, не хто іншы, а менавіта папскі нунцый Клаўдыё Рангоні ў 1601 г. асвяціў знакаміты нясвіжскі касцёл Божага Цела, пабудаваны па праекце італьянскага архітэктара Джавані Марыя Бернардоні і па распараджэнні Мікалая Хрыстафора Радзівіла «Сіроткі».

свайго «выратавання» Лжэдзмітрый паведаміў святару-езуіту, разлічваючы атрымаць падтрымку з боку папства.

На працягу XVI ст. у Рыме чулі шмат абяцанняў уніі, сумеснага паходу супраць Асманскай імперыі, просьбы аб царскім тытуле і г. д. Масква была зацікаўленая ў захаванні міру на заходніх межах дзяржавы і ўдала выкарыстоўвала для гэтага пасрэдніцтва Курыі. Цесная сувязь перамоваў маскоўскіх князёў і рымскіх папаў з развіццём адносінаў з Каронай і Вялікім Княствам Літоўскім знаходзіць сваё пацверджанне і ў тым, што, мяркуючы па вопісу царскага архіва XVI ст., усе гэтыя матэрыялы знаходзіліся ў адной скрыні [4].

Падтрымліваючы размовы аб антыасманской кааліцыі, Масква ніколі не забывалася пра свае асабістыя мэты і, як пісаў П. Пірлінг, «бразгала зброяй толькі дзеля задавальнення Захаду».

Але ўжо ў красавіку 1604 г. царэвіч Дзмітрый звярнуўся да папы Клімента VIII як каталіцкі ўладар. Даследчык XIX ст. А. Хіжберг падрабязна апісаў падзеі, якія папярэднічалі гэтаму лісту. Лжэдзмітрый прыехаў у Кракаў у суправаджэнні Мнішэка і князя Канстанціна Вішнявецкага і спыніўся ў доме Сандамірскага ваяводы. Тут быў арганізаваны адмысловы банкет, дзе адбылося яго знаёмства з нунцыем Клаўдзіё Рангоні. Лжэдзмітрый сустракаўся з Жыгімонтам III, вёў перамовы з нунцыем і езуітамі. Апошнія нават накіравалі да яго настаяцеля кракаўскай супольнасці – айца Каспера Савіцкага. У хуткім часе Лжэдзмітрый заявіў аб сваім жаданні прыняць каталіцтва і прыступіць да сакрамэнту споведзі.

У сувязі з гэтымі падзеямі адбывалася нарада братоў-езуітаў, сярод якіх быў знакаміты Пётр Скарга [18, с. 272]. У выніку быў дадзены дазвол, і Лжэдзмітрый у прысутнасці Вішнявецкага, а таксама кракаўскага ваяводы адмовіўся ад праваслаўя і спавядаўся. Пасля гэтай падзеі нунцый узначаліў літургію, дзе «царэвіч Дзмітрый» прымаў сакрамэнты і атрымаў ад нунцыя падарунак у выглядзе баранка ў залатой аздобе і 25 дукатаў, і, у сваю чаргу, перадаў вышэй узгаданы ліст да папы [17, с. 39–54].

Зварот «Дзмітрыя Іванавіча» да пантыфіка павінен быў забяспечыць падтрымку з боку Рымскай курыі і паказаць намеры будучага цара: «Буде же Господь Бог откроет мне путь в столицу, принадлежащую мне по наследственному праву и возрит на мою правоту, я нижайше и покорно прошу, дабы ты отец всех Христовых овец не оставил меня без твоего покровительства и помощи. Может Господь бог мною недостойным (рабом своим) расширит славу свою в обращении заблудших душ и в воссоединении в свою церковь великих народов. Кто знает, на что меня сохранил, привел к своей церкви и воссоединил (с нею)» [7; 8, с. 1].

Падтрымка з боку Рыма была неабходнай для Лжэдзмітрыя I, каб адчуваць сябе больш самастойным у адносінах з Жыгімонтам III. На гэты конт Антоніо Пассевіна – удзельнік мірных перамоваў 1582 г. і прадстаўнік

папы, адзначаў, што «маскоўскага цара» можна лічыць у нейкай ступені сынам польскага караля, бо ён паспрыяў прыняццю каталіцкага веравызнання і, што не менш значнае, – дапамог замацавацца на царскім троне.

Відавочна, што беглы манах Грыгорый Атрэп’еў імкнуўся стаць паўнавартасным царом і любая падтрымка яму была нялішняй. Сумніўна, каб ён разважаў у тых умовах пра пытанні міжнароднага становішча краіны, але прызнанне царом (альбо каралём) з боку Рымскай курыі ўмацоўвала яго становішча ў адносінах з Рэччу Паспалітай. Магчымасць канфлікта падцвярджае П. Радрыга Алідозі, пасол герцага тасканскага ў Польшчы: «Когда вчера вечером я беседовал о разных вещах с великим Маршалом Литвы… и с Воеводой Троцким.., а также с другими видными кавалерами… и случайно завёл разговор о Московском Царе, – то они мне сказали, что нельзя было полагаться на примирившихся врагов, что они никогда не верили в продолжительность мира между Поляками и Московитами, и что Дмитрий в письменных сношениях с его Величеством воздавал ему все принадлежащие титулы, за исключением Герцога Ливонии…» [6, с. 99–125].

У лістападзе 1605 г. праз папскага пасла Аляксандра Рангоні Лжэдзмітрый I накіраваў зварот да Жыгімонта III, у якім пытаўся аб прычынах недаверу да яго і аб непрызнанні царскага тытулу [11, с. 226–227]. На гэтыя пытанні нунцый адказаў тым, што кароль знаходзіцца ў такім стане, што без згоды паноў не мае магчымасці нічога прыняць і зацвердзіць [11, с. 268].

Кантакты з Рымам актыўна падтрымліваліся на працягу ўсяго перыяду даравання першага самазванца. Пра гэта сведчыць і вопіс архіва Пасольскага прыказу [3]. Акрамя гэтага, з Лжэдзітрыем I пастаянна знаходзіліся прадстаўнікі ордэну езуітаў – Мікалай Чыжоўскі і Андрэй Лавіцкі. Перамовы праходзілі праз пасрэдніцтва польскай нунцыятуры, якая з XVI ст. стала не толькі важным структурным элементам Каталіцкага Касцёла, але і актыўным удзельнікам палітычнага жыцця [5, с. 220]. Дзейнасць нунцыяў не абмяжоўвалася толькі паведамленнямі аб выкананні сваіх непасрэдных царкоўных задач. Нунцыі даносілі ў Рым пра ўсё, што адбывалася ў дадзенай краіне, паведамлялі пра ўсе сустрэчы і размовы, у падрабязнасцях апісвалі сваё стаўленне да розных дзяржаўных дзеячаў. Вельмі часта да рапартаў прыкладаліся копіі найбольш важных і цікавых лістоў (часам у Рым адпраўляліся арыгіналы). Нунцыі сачылі за ходам палітычных і грамадскіх спраў у дзяржаве. Таму матэрыялы нунцыятуры – гэта вельмі каштоўная крыніца інфармацыі, у тым ліку па гісторыі Смутнага часу ў Расіі.

Як і на працягу амаль усяго XVI ст., пытанне антыасманскай кааліцыі падымалася і ў гэты час. Лжэдзмітрый I у сваёй грамаце да папы Паўла V, у якой віншаваў яго з выбраннем на Святы Прастол, паведамляў пра жаданне весці вайну з ворагамі хрысціянства і прасіў, каб папа па гэтым пытанні правёў перамовы з рымскім імператарам: «возложа надежду на Его княже-

скую помощь и покровительство, восприяли намериние не в праздности и бездействии жизнт проводить, но по крайней возможности стараться о пользе церкви святой и всего Христианства, и для того соединить наше войско с силами древнейшего Императора Римского на жесточайших и бесчеловечнейших врагов креста Христова… вас же убедительно просим, по вашей при дворе пресвятейшего Императора Римского важности, уговорить его Величество, дабы не заключал с туркою мира или какого перемирья, но общий бы с нами совет держал о продолжении войны против него…» [11, с. 232–233].

Лжэдзмітрый I імкнуўся паказаць, што менавіта зараз ідэя антыасманскай кааліцыі можа атрымаць рэальныя абрысы, бо царскі трон займае католік, які захоўвае мірныя адносіны з каралём Жыгімонтам III, і ўсе сілы можна скіраваць супраць агульнага ворага. На такі стан рэчаў звярнуў увагу і Антоніо Пассевіна: «Но теперь, когда сверх всякого человеческого помышления, Бог сделал так, что мир между Польшей и Московией продлится, вероятно, надолго… Ваше Высочество [герцог Тосканский] предвидите, какие могут последовать причины для того, чтобы Венгерские дела не шли вперед там плачевно, как до сих пор, и чтобы столь великие государства, каковы Польша и Московия, вступили в союз с Императором для поддержания того, что, иначе, кажется подвергает сильнейшей опасности Италию и Германию…» [16, с. 271–275].

У гэтым жа накірунку можна разглядаць і абвешчаны першым самазванцам паход на Крым [10, с. 147]. Але ён не здзейсніўся. У маі 1606 г. Лжэдзмітрый I быў забіты.

Другі самазванец не меў падтрымкі і сувязей з Рымам, нягледзячы на тое, што Марына Мнішэк звярталася за дапамогай  да нунцыя Сіманетта [12, с. 349–350]. Гібель Лжэдзмітрыя II была ўспрынята ў Рыме як добрая вестка. Восенню 1609 г. Жыгімонт III пачаў аблогу Смаленска. Папа Павел V накіраваў каралю спецыяльнае брэвэ, у якім ухваляў яго дзеянні. Уваход С. Жалкеўскага ў Маскву, прысяга каралевічу Уладыславу з радасцю сустрэліся ў Рыме [14, с. 12, 187–188]. Выбранне Міхаіла Раманава перакрэсліла надзеі на цара-католіка і фактычна прыпыніла больш чым на 50 гадоў дыпламатычныя кантакты Расійскай дзяржавы і Рымскай курыі.

Дзякуючы працам гісторыкаў XIX ст., дасягненням савецкай гістарыяграфіі, найноўшым даследаванням архіўных матэрыялаў можна даць у агульным выглядзе схему Смуты пачатку XVII ст., яе перыядызацыю, прычыны. Але па-ранейшаму актуальныя словы, сказаныя больш за 100 гадоў таму: «Смута дзівіць сваёю нявысветленасцю, нявызначанасцю ... », гэта не «палітычная рэвалюцыя» і не сацыяльны пераварот [1, с. 681]. Вывучэнне характару ўзаемаадносінаў Масквы і Рыма ў гэты перыяд таксама ўкладваецца ў такую схему. Рымская авантура Лжэдзмітрыя I – імкненне скарыстацца ў бягучы момант аўтарытэтам, матэрыяль-

нымі сродкамі і магчымасцямі папства, польскай нунцыятуры, каталіцкіх святароў. Уражвае, што тактыка «заляцанняў» з Рымам у выглядзе абяцанняў уніі, сумеснай барацьбы з Асманскай імперыяй, характэрная для XVI ст., знайшла выкарыстанне і ў палітыцы Лжэдзмітрыя І. Рым згадзіўся на гэтую авантуру, нават бачачы яе абмежаванасць. Яшчэ адна рыса Смутнага часу – гэта не толькі спыненне дынастыі, але і значная дэсакралізацыя ўлады, гэтаму паспрыялі таксама і цесныя адносіны з Рымскай курыяй.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Дворниченко, А. Ю.* Смута как фактор российской истории / А. Ю. Дворниченко. – Вестник С.-Петерб. ун-та. – 2018. – Т. 63. – Вып. 3. – С. 677–701.

2. *Костомаров, Н.* Лжедмитрий Первый / Н. Костомаров // Русская старина. – 1876. – Т. 15. – С. 1–8.

3. Опись архива Посольского приказа 1626 года / под ред. д-ра ист. наук С. О. Шмидта. – М.: Центр. гос. архив древних актов, 1977. – Ч.1. – 416 с.

4. Опись Царского архива XVI в. и архива Посольского приказа 1614 г. / под ред. С. О. Шмидта. – М.: Изд-во восточной литературы, 1960. – 195 с.

5. Памятники дипломатических отношений древней России с державами иностранными // Сборник Русского исторического общества. – СПб.: Тип. Г. Лисснера и Д. Собко, 1912. – Т. 137. – 830 с.

6. *Пирлинг, П.* Из Смутного времени: статьи и заметки / П. Пирлинг. – СПб.: Изд. А. С. Суворина, 1902. – 269 с.

7. Письмо Первого Самозванца к папе Клименту VIII [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vostlit.narod.ru/Texts/Dokumenty/Polen/XVII/1600-1620/LzedmitrijI/brief_klementVII_28.04.1604.htm. – Дата доступа: 01.03.2021.

8. *Пташицкий, С. Л.* Письмо первого Самозванца к папе Клименту VIII / С. Л. Пташицкий. – СПб.: Тип. Акад. наук, 1899. – 48 с.

9. Смутное время Московского государства. 1604–1613 гг. – М.: Имп. о-во истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1910–1918. – Вып. 1: Акты времен Лжедмитрия I-го. (1603–1606 гг.) / под ред. Н. В. Рождественского. – 1918. – 328 с.

10. Смутное время Московского государства. 1604–1613 гг.: Материалы, изд. Имп. О-вом истории и древностей рос. – М.: Имп. о-во истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1910–1918. – Вып. 1: Акты времен Лжедмитрия I-го (1603–1606 гг.). – 1918.

11. Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегии иностранных дел. – М.: Тип. Селивановского, 1819. – Т. II. – 399 с.

12. Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегии иностранных дел. – М.: Тип. Селивановского, 1822. – Т. III. – 566 с.

13. Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной коллегии иностранных дел. – М.: Тип. Селивановского, 1826. – Т. IV. – 678 с.

14. *Шмурло, Е. Ф.* Римская курия на русском православном востоке в 1609–1654 годах / Е. Ф. Шмурло. – Прага: Орбис, 1928. – 255 с.

15. Acta Nuntiaturae Polonae. – Kraków: Academia scientarum et litterarum Polona, 2000. – T. XV: Germanicus Malaspina (1591–1598), vol. 1 (1 XII 1591 – 31 XII 1592) / ed. Leszek Jarmiński. – 467 p.

16. *Bojko, K.* Stosunki dyplomatyczne Moskwy z Europą Zachodnią w czasach Iwana III / K. Bojko. – Kraków: Księgarnia Akademicka, 2010. – 221 s.

17. *Hirschberg, A.* Dymitr Samozwaniec / A. Hirschberg. – Lwów: Gubrynowicz i Schmidt, 1898. – 292 c.

18. Listy Piotra Skargi T. J. z lat 1566 - 1610 / Piotr Skarga, wyd. Jan Sygański. – Kraków: Nakł. wydawn. Towarzystwa Jezusowego, 1912. – 615 s.

19. *Nowakowski, F.* Źródła do dziejów Polski / F. Nowakowski. – Berlin: B. Behr, 1841. – 864 s.

20. *Smołucha, J.* Papiestwo a Polska w latach 1484 – 1526. Kontakty dyplomatyczne na tle zagrożenia tureckiego / J. Smołucha. – Kraków: Societas Vistulana, 1999. – 247 s.

**(Дата падачы: 24.02.2022 г.)**

*Н. Б. Щавлинский*
Белорусский национальный технический университет, Минск

*M. Shchaulinski*
Belarusian National Technical University, Minsk

**УДК 940.3/4+325.8(476)**

# ИСТОЧНИКИ И ЛИТЕРАТУРА ПО ИЗУЧЕНИЮ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ БЕЛОРУССКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ И ОБЩЕСТВ В КИЕВЕ И ОДЕССЕ В 1917–1918 ГГ.

# SOURCES AND LITERATURE ON THE STUDY OF THE BELARUSIAN ORGANIZATIONS' ACTIVITIES IN KIEV AND ODESSA IN 1917–1918

*В статье исследуются архивные материалы и литература по изучению деятельности белорусских национальных организаций в Киеве и Одессе в 1917–1918 гг. Подчеркивается, что основную роль в объединении белорусов и беженцев, проживавших в годы Первой мировой войны на территории Украины, сыграли такие белорусские организации, как «Белорусская организация на Украине», «Белорусская техническая организация», «Белорусский национальный комиссариат», «Белорусский гай» и др.*

*Ключевые слова: Первая мировая война; деятельность белорусских национальных организаций в Киеве и Одессе; документы архивов Минска и Киева.*

*The article examines archival materials on the study of the Belarusian national organizations activities in Kiev and Odessa in 1917–1918. It is emphasized that the main role in the unification of the Belarusians and refugees who lived on the territory of Ukraine during the First World War was played by such Belarusian organizations as the «Belarusian Organization in Ukraine»,*